# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

23 кастрычніка 2003 года, чацвер, № 16 (1881)

СУСТРЭЧЫ

## Ідэалогія ў ВНУ



16 кастрычніка ў актавай зале ліцэя БДУ адбылася сустрэча намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Алега Вітольдавіча Праляскоўскага са студэнтамі і выкладчыкамі нашага універсітэта. У рамках адзінага дня інфармавання насельніцтва А.В. Праляскоўскі выступіў з тэмай "Аб ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці. Пастаноўка ідэалагічнай працы ў ВНУ". Пасля выступлення госць адказаў на шматлікія пытанні студэнтаў.

Дарэчы, А.В. Праляскоўскі з адзнакай закончыў юрыдычны факультэт БДУ. Напрыканцы сустрэчы першы прарэктар нашага універсітэта А.А. Яноўскі ўручыў госцю значок і сувенір у выглядзе сімвала БДУ — папараць-кветкі.

*Фотаздымкі Аляксандра СНАПКА*



ВІНШУЕМ!

## Ордэн Дружбы — прафесару БДУ

Дырэктар навукова-даследчай установы "Нацыянальны навукова-вучэбны цэнтр фізікі часціц і высокіх энергій" БДУ прафесар Мікалай Максімавіч Шумейка 9 кастрычніка быў узнагароджаны ордэнам Дружбы Расійскай Федэрацыі. Высокую ўзнагароду ў зале пасяджэнняў вучонага савета БДУ перадаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол РФ у Рэспубліцы Беларусь Аляксандр Блахін. Ордэн М.М. Шумейка атрымаў за вялікі ўклад ва ўмацаванне міжнароднага навуковага супрацоўніцтва. Выступаючы на цырымоніі, М.М. Шумейка падзякаваў сваім калегам і паплечнікам з Беларусі і Расіі. Навуковец зазначыў, што сёння вельмі важнае значэнне мае міжнароднае супрацоўніцтва, бо яно спрыяе аднаўленню адзінай навуковай прасторы.



М.М. Шумейка нарадзіўся 22 верасня 1942 г. у г. Дуброўна Віцебскай вобласці. У 1966 г. ён з адзнакай скончыў фізічны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта. У 1971 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю. З 1970 г. працаваў на кафедры тэарэтычнай фізікі нашага універсітэта. У 1984 г. абараніў доктарскую дысертацыю. У 1986 г. М.М. Шумейка перайшоў на працу ў НДІ ядзерных праблем на пасаду намесніка дырэктара па навуковай рабоце. У 1993 г. паводле яго ініцыятывы быў створаны Нацыянальны навукова-вучэбны цэнтр фізікі часціц і высокіх энергій БДУ, дзе М.М. Шумейка дагэтуль працуе дырэктарам. Пад яго кіраўніцтвам абаронена 9 кандыдацкіх дысертацый, ён быў кансультантам пры падрыхтоўцы 2 доктарскіх дысертацый. М.М. Шумейка — намеснік старшыні Нацыянальнага каардынацыйнага савета па фізіцы часціц і высокіх энергій і сукаардынатар Дзяржаўнай праграмы фундаментальных даследаванняў "Фізіка ўзаемадзеянняў" і міжвузаўскай праграмы фундаментальных даследаванняў "Мікрасвет і рэчыва". Навуковец апублікаваў больш за 150 артыкулаў у вядучых навуковых выданнях.

*Ірына САНКЕВІЧ*

ПАДЗЕІ

## Вучэнні па грамадзянскай абароне

28 кастрычніка ў будынку фізічнага корпуса БДУ адбудуцца паказальныя вучэнні па грамадзянскай абароне насельніцтва. Па словах начальніка штаба грамадзянскай абароны БДУ Сцяпана Сямёнавіча Пірожніка, гэтая падзея стане вынікам пяцігадовай напружанай падрыхтоўкі, якая складалася з рэгулярных заняткаў паводле тэарэтычнага і практычнага курсаў. На вучэннях будуць паказаны інсцэніроўкі дзеянняў па зададзеных сітуацыях. Усім стане зразумела, што і як трэба рабіць у канкрэтных выпадках: пажарах, хімічных выкідах і г.д.

Трэба адзначыць, што такія мерапрыемствы маюць вялікае значэнне. Гэта не толькі паўтор таго, што мы калісьці слухалі ў школе і ВНУ на занятках па спецыяльнай падрыхтоўцы. Гэта правілы паводзінаў на тэрыторыі БДУ ў некаторых небяспечных сітуацыях.

*Ірына САНКЕВІЧ,*
*студэнтка II курса факультэта журналістыкі*

КОНКУРСЫ

## Кандыдаты на прэміі

Раз у два гады ў БДУ праходзяць конкурсы на прысуджэнне прэмій імя У.І. Пічэты (у галіне сацыяльных і гуманітарных навук) і А.Н. Сеўчанкі (у галіне прыродазнаўчых навук).

Прэміі ўручаюцца навукоўцам Беларускага дзяржаўнага універсітэта за выдатныя дасягненні, якія ўключаюць:

— навуковыя працы па перспектыўных напрамках, якія робяць каштоўны ўклад у развіццё дадзенай галіны навукі і тэхнікі;

— стварэнне новай тэхнікі, тэхналогій і матэрыялаў;

— працы па захаванні рэсурсаў і энергіі, ахове навакольнага асяроддзя і вырашэнні іншых важных для краіны задач;

— распрацоўку новых адукацыйных тэхналогій, якія павышаюць узровень падрыхтоўкі спецыялістаў;

— стварэнне падручнікаў, навучальных дапаможнікаў і вучэбнага абсталявання.

Для арганізацыі і правядзення конкурсу створаны дзве адпаведныя камісіі, якімі кіруе рэктар універсітэта.

На цяперашні момант ужо закончана абмеркаванне працаў у камітэтах конкурсных камісій, якія вызначылі кандыдатаў на прысуджэнне прэмій. На атрыманне прэміі імя У.І. Пічэты былі вылучаны: А.А. Лойка (філалагічны факультэт), В.А. Фядосік (гістарычны факультэт), І.І. Марціновіч (юрыдычны факультэт). На атрыманне прэміі імя А.Н. Сеўчанкі былі вылучаны: П.І. Манастырны (ФПМІ), рэктар А.У. Казулін і аўтарскі калектыў геаграфічнага факультэта — І.І. Пірожнік, В.С. Аношка, Р.А. Жмойдзяк, Г.І. Марцінкевіч, калектыў прадстаўнікоў фізічнага факультэта — Я.С. Варапай, А.П Клішчанка, А.А. Мінько, У.І. Папечыц.

*Ірына САНКЕВІЧ,*
*студэнтка II курса факультэта журналістыкі*



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
23 кастрычніка 2003 года, чацвер, № 16 (1881)

КАНФЕРЭНЦЫІ

# Бібліятэкі і інфармацыйныя тэхналогіі

Міжнародная канферэнцыя "Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі і сацыяльная значнасць бібліятэк" адбудзецца 29—30 кастрычніка. Арганізуюць яе Беларуская бібліятэчная асацыяцыя, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Фундаментальная бібліятэка БДУ.

Канферэнцыя арыентуецца на вызначэнне асноўных кірункаў дзейнасці бібліятэк у сучасным інфармацыйным грамадстве, выкарыстанне сеткавых інфармацыйных рэсурсаў, удасканальванне бібліятэчнай адукацыі ў сістэме інфармацыйна-дакументных камунікацый, развіццё міжнародных сувязяў бібліятэк і бібліятэчных супольнасцяў. Удзел у мерапрыемстве прымуць больш за 250 спецыялістаў у галіне бібліятэчна-інфармацыйных тэхналогій з Беларусі, Расіі, Літвы, Украіны.

Падчас правядзення канферэнцыі будуць працаваць выставы праграмных прадуктаў для бібліятэк, прадукцыі на CD-ROM, часопіснай/газетнай прадукцыі, інфармацыйных прадуктаў бібліятэк (інфармацыйных цэнтраў) пасольстваў ЗША, Францыі, Германіі, сістэмаў абароны кніг ад выкрадання, бібліятэчнага абсталявання.

*Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ*

АБ'ЯВЫ

НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ЎСТАНОВА "ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А.Н. СЕЎЧАНКІ" БДУ
**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

загадчыка лабараторыі — 1;
вядучага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці 01.04.21 (лазерная фізіка) — 2;
навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці 01.04.10 (фізіка паўправаднікоў і дыэлектрыкаў) — 1;
навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці 05.13.14 (сістэмы апрацоўкі інфармацыі і кіравання) — 1;
навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці 01.04.21 (лазерная фізіка) — 2;
малодшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці 05.04.09 (машыны і апараты хімічных вытворчасцяў) — 1;
малодшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці 05.13.06 (аўтаматызаваныя сістэмы кіравання) — 2;
малодшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці 01.04.21 (лазерная фізіка) — 1;
малодшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці 05.13.11 (матэматычнае і праграмнае забеспячэнне вылічальных машын, комплексаў, сістэм і сетак) — 1.

*Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Дакументы накіроўваць на адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7. Тэлефон 277-48-43.*

АЛІМПІЯДЫ

# Нашы — лепшыя!

Школьнікі Беларусі сталі абсалютнымі пераможцамі XVIII Нацыянальнай алімпіяды юных матэматыкаў Літвы, арганізаванай Вільнюскім універсітэтам. У алімпіядзе заўжды ўдзельнічалі толькі каманды Літвы, сёлета для каманды Беларусі было зроблена выключэнне. Нашу краіну прадстаўлялі навучэнцы ліцэя БДУ Вольга Шут, Міхаіл Блоцкі, Андрэй Жэмайтук, вучні мінскіх школаў №№ 41 і 51 Іван Блізнец і Міхаіл Карпук. Нашая каманда на 20 балаў апярэдзіла бліжэйшых супернікаў — каманды ліцэяў Вільнюскага ўніверсітэта і Каўнаскага політэхнічнага ўніверсітэта.

Перамога беларускіх школьнікаў азначае, што каманда беларускіх матэматыкаў будзе ўдзельнічаць у наступнай алімпіядзе юных матэматыкаў Літвы. З перамогай нашу каманду павіншаваў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Літве Уладзімір Гаркун.

*Паводле інфармацыі БЕЛТА*

РАСПРАЦОЎКІ

# Матэрыялы для фільтраў

Унітарнае прадпрыемства БДУ "Унітэхпрам" разам з Інстытутам фізіка-арганічнай хіміі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі наладзіла вытворчасць новага валакністага матэрыялу — сульфакатыянітy. Гэты матэрыял выкарыстоўваецца пры вырабе фільтраў для ачысткі паветра ад аміяку і амінаў. Такія фільтры выкарыстоўваюцца на прадпрыемствах электроннай, медыцынскай і харчовай прамысловасці.

Гэты матэрыял беларускія навукоўцы распрацоўвалі на працягу 20 гадоў. Аналагі, якія каштуюць нашмат даражэй, удалося стварыць толькі японскім навукоўцам. Жаданне набыць партыі гэтага матэрыялу ўжо выказалі прадпрыемствы ЗША, Германіі, Паўднёвай Карэі.

# Новая экспертная сістэма

Навукоўцы нашага ўніверсітэта распрацавалі аўтаматызаваную экспертную сістэму падтрымкі рашэнняў у артапедыі АРТА-ЭКСПЕРТ.

Паводле словаў аднаго з аўтараў, загадчыка кафедры матэмабеспячэння АСК Віктара Краснапрошына, дзеянне сістэмы ахоплівае ўвесь лекава-дыягнастычны працэс ад абследавання да выбару тактыкі лячэння паталогіі пазваночніка, верхніх і ніжніх канечнасцяў. Магчымасці сістэмы дазваляюць атрымліваць звесткі даведачна-энцыклапедычнага характару, неабходныя спецыялісту любога ўзроўню кваліфікацыі. База даных уключае веды для дыягностыкі і лячэння 100 дыягназаў верхніх канечнасцяў і 123 — ніжніх, каля 50 хваробаў пазваночніка. Анатамічны атлас змяшчае 119 візуальных прыкметаў хваробаў, такіх як дэфармацыі, прыпухласці, болевыя зоны, участкі парушанай адчувальнасці.

*Паводле інфармацыі БЕЛТА*

ВЫСТАВЫ

# Казачныя камяні

З 15 па 19 кастрычніка праходзіла чарговая мінералагічная выстава "Каменная казка". Размяшчалася яна ў галоўным корпусе нашага універсітэта. Са сваімі калекцыямі завіталі на яе госці з Харкава, Кіева, Еўпаторыі, Масквы, Санкт-Пецярбурга, Усы (на Урале). Былі і ўдзельнікі з нашай сталіцы.

На выставе можна было ўбачыць (і пры нагодзе купіць) ювелірныя ўпрыгожванні і вырабы з натуральных камянёў, дрэва, іншых матэрыялаў. Наведвальнікаў маглі зацікавіць узоры мінералаў і горных парод. Напрыклад, рэдкія па памерах і эстэтычных якасцях камяні з розных краінаў свету: лазурыт з Афганістана, тапаз з Украіны, малахіт з Конга, цытрын з Бразіліі і г.д. Многія экспанаты выставы прысвячаліся астралагічнаму кірунку: прыхільнікі гараскопаў мелі магчымасць адшукаць для сябе не толькі амулеты, але і спецыялізаваную навукова-папулярную літаратуру. Не расчараваліся і зацікаўленыя ўсходняй культурай: на выставе можна было ўбачыць і драўляных будаў, і араматызаваныя палачкі і алеі, ружанцы...



"Каменная казка" зноў і зноў пераконвае нас, што прырода стварае сама і дае чалавеку магчымасць ствараць цудоўнае і непаўторнае. Каштоўны камень, на які тысячагоддзямі дзьмулі вятры і свяціла сонца, у руках майстра можа ператварыцца ў бессмяротны мастацкі твор. Тыя, хто яшчэ не ўпэўніўся ў гэтым, змогуць наведаць наступную выставу, якая адбудзецца 10—14 снежня.

*Ірына САНКЕВІЧ, студэнтка II курса факультэта журналістыкі*

СВЯТЫ

# Тыдзень маці прайшоў у БДУ

З 6 па 14 кастрычніка ў Беларускім дзяржаўным універсітэце прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя Дню маці. Пачаліся яны з дабрачыннай акцыі для жанчын — ветэранаў БДУ. Потым была наладжана сустрэча студэнтаў са шматдзетнымі маці. Адбылася таксама і творчая вечарына з паэткай Людмілай Рублеўскай. 10 кастрычніка маладыя сем'і змаглі сустрэцца з псіхолагамі, а 14 кастрычніка ў актавай зале ліцэя БДУ быў арганізаваны заключны святочны канцэрт, прысвечаны Дню маці. Свята адбылося дзякуючы Саюзу жанчын БДУ і яго спонсарам, у ролі якіх выступілі міжнароднае дабрачыннае аб'яднанне "Сафія", міжнароднае грамадскае аб'яднанне "Надзея-экспрэс" і аб'яднанне "Counterpart", а таксама дабрачынная арганізацыя "АРТ-Глорыя".

Трэба сказаць, што Саюз жанчын працуе ў нашым універсітэце ўжо чатыры гады і ўвесь гэты час ён ладзіць святы, на якіх жанчыны могуць сустрэцца, пагаварыць, пахваліцца сваімі дзецьмі. І што цікава, яны ніколі не застаюцца без падарункаў.

*Ганна АНАТОЛЬЕВА*

*Фотаздымкі Генадзя КРАСКОЎСКАГА*







ГОСЦІ

# Як стаць шчаслівай

Яна паэтка, празаік, драматург, літаратурны крытык. Яе імя часта з'яўляецца на старонках "ЛіМа" і "СБ — Беларусь сегодня". Яе вершы і проза выходзяць у асобных выданнях і ў часопісах "Маладосць", "Полымя", "Нёман". Гэта Людміла Рублеўская. 9 верасня, напярэдадні Дня маці, па ініцыятыве Саюза жанчын БДУ адбылася сустрэча са славутай госцяй. Прадстаўніцы прыгожага полу сабраліся ў невялічкай зале галоўнага корпуса нашага універсітэта, каб атрымаць адказ на галоўнае жаночае пытанне: як быць шчаслівай?



Людміла Рублеўская распавядала і пра сваю творчасць, і пра сям'ю. Як пражыць у творчым саюзе (муж яе — вядомы паэт Віктар Шніп), выгадаваць дзяцей — пра гэта ішла гаворка на сустрэчы. Пад заканчэнне сустрэчы пасыпаліся пытанні, да таго часу жанчыны проста баяліся парушыць атмасферу, створаную цудоўнай паэткай. Прасілі вершаў, яна чытала — шмат, натхнёна, але адначасова цёпла і непафасна. Перад вачыма нібыта праплывалі героі і гераіні твораў, нехта пазнаваў у іх сябе...

*Алеся КРАЎЧАНКА,*
*студэнтка III курса факультэта журналістыкі*
*Фотаздымак Генадзя КРАСКОЎСКАГА*

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

# Скарбы Фундаментальнай бібліятэкі

У аддзеле рэдкай і каштоўнай кнігі нашай бібліятэкі (прасп. Ф. Скарыны, 4, 2-і паверх) захоўваецца адзін з рэдкіх асобнікаў кнігі Лявонція Магніцкага "Арыфметыка, або навука лічыльная...".

Аўтар працы Лявонцій Філіпавіч Магніцкі (1669—1739) быў першым выдатным рускім педагогам-матэматыкам. Большая частка гісторыкаў лічыць, што паходзіў ён з сялянаў і меў прозвішча "Цяляцін". Паводле адной з версій, прозвішча Магніцкі надаў яму сваім указам Пётр I: маўляў, ён прыцягвае да сябе веды, як магніт.

Верагодна, аўтар "Арыфметыкі" навучаўся ў Славяна-грэка-лацінскай акадэміі ў Маскве. З 1701 г. да канца жыцця выкладаў у матэматыка-навігацкай школе — самай передавой у Расіі на той час. Сваю навуковую працу Л. Магніцкі напісаў у 1703 г. У кнізе змяшчаліся звесткі з галіны арыфметыкі, а таксама частково з алгебры, геаметрыі і нават трыганаметрыі. Праца Л. Магніцкага была сваім часам вельмі папулярнай і як кніга энцыклапедычнага характару, якая змяшчала звесткі з астраноміі, навігацыі і некаторых раздзелаў іншых навук. Нездарма М.В. Ламаносаў называў "Арыфметыку" Л. Магніцкага "брамай вучонасці".

Выданне, якое захоўваецца ў нашай бібліятэцы, мае 325 старонак. Яно каштоўнае як помнік рускага друкаванага майстэрства. Друк двухкалярowy, усе старонкі — у рамках з набраных упрыгожанняў. Медзярыты для кніг падрыхтаваў Міхаіл Карноўскі. Першая застаўка — алегарычны дрэварыт: Арыфметыка ў выглядзе жанчыны, якая сядзіць на троне ў храме навук.

Праца Л. Магніцкага мае шмат звестак, якія да таго расійскія выданні не змяшчалі. Ёсць нават наваўвядзенні, якіх не мелі тагачасныя адпаведныя заходнія падручнікі: напрыклад, Магніцкі лічыць нуль лічбай, уносячы папраўку ў матэматычныя ўяўленні свайго часу.

Сучаснаму чытачу падасца дзіўным вершаваны выклад матэматычнага матэрыялу ў працы Магніцкага, але ў той час многія навуковыя працы пісаліся ў вершах. Лічылася, што так лягчэй запамінаецца. "Арыфметыка" Магніцкага была асноўным падручнікам матэматыкі ў Расіі да сярэдзіны XVIII ст. Потым яго выкарыстоўвалі і як аснову для напісання новых кніг па матэматыцы.

*Алена ХОЛАДАВА,*
*бібліёграф II катэгорыі*
*Фундаментальнай бібліятэкі БДУ*

З ГІСТОРЫІ БДУ

*У кастрычніку спаўняецца 125 гадоў з дня нараджэння вядомага гісторыка Уладзіміра Іванавіча Пічэты — першага рэктара БДУ. У сённяшнім нумары "Беларускага універсітэта" мы змяшчаем дакументы, датычныя жыцця У.І. Пічэты, якія ласкава прадаставіў Музей гісторыі БДУ.*

# Аўтабіяграфія У.І. Пічэты

Нарадзіўся ў Палтаве 9 (22) кастрычніка 1878 г. у сям'і выкладчыка Івана Хрыстафоравіча Пічэты, родам з гарадка Мостара ў Герцагавіне. Мая маці ўкраінка з Кіева.

Закончыў я класічную гімназію ў Палтаве ў 1897 г. і, паступіўшы на гістарычны факультэт Маскоўскага універсітэта, закончыў яго ў 1901 г.

З 1901 г. пачынаецца мая выкладчыцкая дзейнасць, спярша ў сярэдняй, а потым і ў вышэйшай школе, а менавіта:

З 1901 па 1903 г. — у настаўніцкай семінарыі ў м. Карастышаве.

З 1903—1905 г. у Екацярынаславе (камерцыйная вучэльня, мужчынскія гімназіі, гандлёвая школа, жаночая гімназія Н.Н. Таблен, жаночая гімназія С.І. Сцяпанавай).

З 1905 па 1918 — у Маскве (Практычная акадэмія, Аляксандраўская камерцыйная вучэльня, жаночая настаўніцкая семінарыя, гандлёвая школа і інш.).

З 1906 па 1918 — выкладчык Вышэйшых жаночых курсаў у Маскве.

З 1910 па 1911 г. (люты) — прыват-дацэнт Маскоўскага універсітэта.

З 1918 па 1922 г. — прафесар факультэта грамадскіх навук у Маскоўскім універсітэце.

З 1918 па 1922 г. Галоўны інспектар і член калегіі Галоўнага архіўнага ўпраўлення.

З 1921 па 1930 г. — рэктар і прафесар Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

З 1931 г. па 1935 г. — нарміроўшчык і загадчык аддзела кадраў у кааператыве грамадскага харчавання ў Вятцы.

З 1934 па 1935 г. — прафесар педагагічнага інстытута ў Варонежы.

З 1935 па 1938 г. — выкладчык на рабфаку імя У.І. Леніна.

З 1935 па 1937 г. — прафесар Інстытута хлебапякарнай прамысловасці.

З 1938 па 1940 г. — прафесар педагагічнага інстытута імя У.І. Леніна ў Маскве.

З 1939 г. — прафесар Маскоўскага універсітэта.

З 1937 г. — старэйшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі.

У 1910 г. вытрымаў магістарскія іспыты па гісторыі Расіі і пасля прачытання дзвюх уступных лекцый быў зацверджаны ў званні прыват-дацэнта.



У лютым 1911 г. на знак пратэсту пакінуў прыват-дацэнтуру і вярнуўся ва універсітэт толькі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі.

У 1920 г. прымаў удзел у якасці эксперта ў Рыжскай мірнай канферэнцыі.

У 1923—1924 г. прымаў удзел у камісіі пры Наркамзамсправе па рэалізацыі Рыжскага мірнага дагавора.

У 1921 г. быў абраны членам ЦВК БССР і заставаўся да 1930 г. У 1918 г. абараніў доктарскую дысертацыю на ступень магістра гісторыі і праз месяц на ступень доктара рускай гісторыі.

У 1939 г. мне была прысуджана ступень доктара гістарычных навук без абароны дысертацыі.

13 снежня 1928 г. быў зацверджаны ў званні сапраўднага члена АН БССР.

У 1939 г. быў прызначаны заг. кафедры славяназнаўства на гістфаку.

У 1939 г. быў прызначаны заг. сектара славяназнаўства Інстытута гісторыі АН СССР.

У 1943 г. атрымаў званне заслужанага дзеяча навукі Узб. ССР і грамату ад Сяр.-Аз. Вайсковай акругі за абаронна-лекцыйную работу і ганаровую грамату ад рэспубліканскага Саюза дзеячоў вышэйшай школы.

У 1925 г. атрымаў званне заслужанага прафесара Беларусі з нагоды 25-годдзя маёй навукова-выкладчыцкай дзейнасці.

13 лютага 1939 г. быў абраны членам-карэспандэнтам АН СССР.

На працягу 1922—1943 гг. кіраваў працай аспірантаў — пядінстытуты, Маскоўскі універсітэт, Ваенна-паліт. акадэмія, АН БССР, прымаў вялікі ўдзел у грамадскім жыцці і савецкім друку.

Ад пачатку фашысцкай агрэсіі прысвяціў сябе лекцыйнай рабоце ў часцях Чырвонай Арміі. На працягу 1939—1943 гг. мною напісаны дзесяткі водгукаў на кандыдацкія і доктарскія дысертацыі паводле дaручэння дэканатаў Маскоўскага, Кіеўскага, Харкаўскага, Адэскага, Сярэдне-Азіяцкага універсітэтаў, а таксама Інстытута гісторыі АН СССР.

Навуковая дзейнасць пачалася з 1903 г. і працягваецца да цяперашняга часу.

Цяпер мне споўнілася 65 гадоў, але я не падымаў пытання аб прызначэнні мне пенсіі, і лічу няёмкім пра гэта хадайнічаць, пакуль я працую.

*Праф. У.І. ПІЧЭТА*

# Ліст Уладзіміра Іванавіча Пічэты сваёй дачцэ

*Маёй Ксянюрцы!*

*Яшчэ трошкі часу, і ты пачнеш свой самастойны жыццёвы шлях. Я хачу, каб ты была маладая, каб радасць яркім сонечным святлом асвятляла тваю пяцічотную душу; я хачу, каб ты была моцная і вытрымала націск дзевятага вала жыццёвага шляху. Я хачу, каб ты смяялася, каб гора і смутак не азмрочвалі твайго жыцця. Хай будзе яно светлае... Будзь смелая, настойлівая ў дасягненні шчасця і цвёрдая ў смутку. Аганяй чорную тугу: яна старыць і сушыць сэрца, гавары заўсёды: "Хай будзе радасць у жыцці!" Гучна крычы: "Няхай жыве жыццё!" Будзь заўжды маладая. Ніколі не схіляй сваёй галоўкі да зямлі і не ўздымай яе да неба. Глядзі проста перад сабой, пільна і ўважліва, і ты знойдзеш правільны шлях у жыцці. Хаця ты яшчэ расцеш і толькі становішся дарослай, набірайся маладосці і бадзёрасці для доўгага жыцця... З маладой душой можна ўсё перанесці.*

*Уставай рана на досвітку. Хай сонца сваім прывітаннем абудзіць цябе... Ты маладая, твая будучыня наперадзе. Ты будзеш бачыць новае жыццё. Ты яшчэ паваюеш!*

*18 травеня 1921 г.*
*Бацька*



*Праўленне БДУ, 1927 г.*

# Дыплом аб заканчэнні Маскоўскага універсітэта

Прад'яўнік гэтага, Уладзімір Іванавіч Пічэта, веравызнання праваслаўнага, сын протаіерэя, пасля вельмі здавальняюча вытрымання ў Маскоўскім універсітэце, у 1898 і 1899 гадах, паўкурсавога іспыту і пасля заліку вызначанай Статутам колькасці паўгоддзяў на гісторыка-філалагічным факультэце названага Універсітэта, у красавіку і ў маі 1901 года, прычым паказаў наступныя поспехі:

1) па сачыненні — вельмі здавальняюча;

2) па пісьмовых адказах па рускай гісторыі — вельмі здавальняюча, па ўсеагульнай гісторыі — вельмі здавальняюча;

3) па вусных адказах: па грэчаскай мове — вельмі здавальняюча, па лацінскай мове — вельмі здавальняюча, па рускай гісторыі — вельмі здавальняюча, па старажытнай гісторыі — вельмі здавальняюча, па сярэдняй гісторыі — вельмі здавальняюча, па новай гісторыі — вельмі здавальняюча, па гісторыі царквы — вельмі здавальняюча, па гісторыі славянскіх народаў — вельмі здавальняюча, па гісторыі новай філасофіі — вельмі здавальняюча.

Паводле гэтага і на падставе арт. 81 Агульнага Статута імператарскіх расійскіх універсітэтаў 23 жніўня 1884 г. п. Пічэта на пасяджэнні гісторыка-філалагічнай выпрабавальнай камісіі 31 мая 1901 г. уганараваны дыпломам першай ступені, з усімі правамі і перавагамі, пайменаванымі ў арт. 92 Статута і ў п. V Найвысачэйша зацверджанай у 23 дзень жніўня 1884 г. меркавання Дзяржаўнай Рады.

У завярэнне гэтага і выданы дыплом п. Пічэту, за належным подпісам і з дадаткам пячаткі Упраўлення Маскоўскай навучальнай акругі.

*Горад Масква, верасень 5 дня 1901 г.*
*Апякун Маскоўскай навучальнай акругі П. Някрасаў*
*Старшыня Гісторыка-філалагічнай Выпрабавальнай Камісіі Грот*

ЮБІЛЕІ

# Лектар вышэйшай школы

## (З нататак аб лектарскім майстэрстве)



...Неспадзяванасць падпільноўвала ўжо каля ўваходу ў аўдыторыю: слухачам не хапала месцаў. Вялікі натоўп студэнтаў групаваўся на калідоры, гудзеў, як растрывожаны вулей. Сярод юнакоў Уладзімір Аляксандравіч заўважыў некалькі курсантаў у вайсковай форме — аб іх прысутнасці на лекцыі ніхто не папярэджваў. Высветлілася, што гэта навучэнцы новага ваеннага факультэта БДУ, будучыя ваенныя псіхолагі. Зразумеў, што прыйдзецца перабудоўваць лекцыю з улікам новых слухачоў. Недзе ў сярэдзіне лекцыі выкладчык заўважыў, што ў памяшканні не хапае паветра, хоць, здаецца, фортка была адкрыта насцеж. Бакавым зрокам адзначыў, што, бадай, ніхто на гэта і ўвагі не звяртае. Неспадзяванка чакала пасля завяршэння лекцыі.

— Вы так умееце трымаць увагу аўдыторыі! — сказаў у вочы выкладчыку, затрымаўшыся на хвіліну, адзін са студэнтаў.

— Дзякуй за ўрок! — захоплена прамовіла дзяўчына на першай парце, яшчэ не прывыкшы да універсітэцкай тэрміналогіі...

І сапраўды! Цяжка паверыць, але першая лекцыя дацэнта У. Навумовіча ў сёлетнім навучальным годзе для студэнтаў-першакурснікаў аддзялення псіхалогіі факультэта філасофіі і сацыяльных навук з добры дзесятак разоў перапынялася апладысментамі — аж пакуль лектар сам не супакоіў слухачоў. Прыёмаў лектарскага майстэрства ў дацэнта У. Навумовіча назапашана шмат, іх можна пералічваць доўга, бо кожная лекцыя чытаецца ім як першая і апошняя ў жыцці, на высокай і даверлівай ноце, як момант найвышэйшага духоўнага і фізічнага напружання. Як вынік бяссонных начэй, пералапачаных, прапушчаных праз уласнае сэрца соцень кніг і артыкулаў не толькі прафесійных літаратуразнаўцаў, пісьменнікаў, але і філосафаў, сацыёлагаў, гісторыкаў, правазнаўцаў.

На творчым рахунку Уладзіміра Аляксандравіча Навумовіча дзве манаграфіі, вучэбныя праграмы, дапаможнікі, кнігі мастацкай прозы, больш як 150 навуковых прац. Гэта той набытак, які і дазваляе навукоўцу быць у шэрагу найлепшых лектараў-славеснікаў універсітэта. У.А. Навумовіч з'яўляецца аўтарам арыгінальнай кнігі "Беларуская літаратура", дапушчанай Міністэрствам адукацыі ў якасці навучальнага дапаможніка для навучэнцаў сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных устаноў Беларусі. Гэты ладны томік быў па-мастацку аформлены самім аўтарам — на вокладцы выявы вежаў Мірскага замка, а ў сярэдзіне на шматлікіх старонках — дзеячы беларускай навукі і культуры, у тым ліку і скульптурныя выявы першаасветнікаў, што паўсталі ў двары універсітэцкага гарадка. А вежы? "Зірнеш — і ўспамінак свежы, пра родны край, наш БДУ — і замка Міра вежы..."



*На фота: свой першы візіт першы беларускі касманаўт Пятро Клімук пасля палёту ажыццявіў менавіта ў БДУ. Стаяць: сакратар камітэта камсамола БДУ У.А. Навумовіч, першы прарэктар БДУ А.Я. Малышаў, дэкан геаграфічнага факультэта М.Т. Раманоўскі, сакратар парткама БДУ Т.Я. Дударава. Фота Д. Прэса.*

Уладзімір Аляксандравіч Навумовіч нарадзіўся 29 кастрычніка 1943 года якраз на Міршчыне ў сям'і вясковай настаўніцы. Закончыў Ярэміцкую сярэднюю школу Карэліцкага раёна, паступіў у першы "хрушчоўскі" набор у БДУ на філалагічны факультэт. Вучыўся з імпэтам. На трэцім курсе паэт-прафесар А. Лойка ўзяў са стосіка курсавых прац Уладзіміра Навумовіча і рэзюмаваў: "Лепшая". І з таго часу ўважліва сачыў за творчым ростам свайго вучня, а пазней першага афіцыйнага аспіранта, які падчас навучання ў аспірантуры быў Ленінскім стыпендыятам.

Вось ужо трыццаць гадоў, з кастрычніка 1973 г., пераступае парог сваёй альма-матэр настаўнік і навуковец. Кім толькі ні прыходзілася працаваць: сакратар камітэта камсамола, намеснік сакратара парткама БДУ, загадчык кафедры рускай мовы на падрыхтоўчым факультэце для замежных грамадзян, а пазней на працягу многіх гадоў узначальваў кафедру беларускай мовы і літаратуры для прыродазнаўчых факультэтаў, якая ў апошнія гады атрымала назву беларусазнаўства. У 1975 г. у ЗША У. Навумовіч прадстаўляў БДУ на IV Сустрэчы савецкай і амерыканскай моладзі. Ён чытаў лекцыі па запрашэнні Лонданскага універсітэта ў Англіі і ўдзельнічаў у працы моўных семінараў у Славеніі, Харватыі, Сербіі, Македоніі.

У 1990—1994 гг. па ініцыятыве У. Навумовіча пры БДУ была створана Міжнародная школа беларускай мовы, літаратуры і культуры, слухачамі якой сталі навукоўцы-славісты з Аўстрыі, Бельгіі, Германіі, Вялікабрытаніі, Італіі, Славеніі, Македоніі, Канады, ЗША, Расіі, Егіпта, Японіі, Францыі, Чэхіі і інш. Дзякуючы працы школы ў некаторых краінах свету ўтварыліся культурна-асветніцкія і навуковыя цэнтры па вывучэнні мовы, літаратуры і культуры Беларусі.

Дацэнт У. Навумовіч распрацаваў праграму і стаў ініцыятарам праекта і сааўтарам навучальнага дапаможніка "Беларусазнаўства", што ствараў завершаны цыкл лекцый і практычных заняткаў спецкурса, у змесце якога даваліся інтэгральныя веды пра Беларусь і беларусаў на новай аснове ("ментальнасць", "нацыянальны характар", "этнічная гісторыя", "геапалітыка", "святы, абрады, звычаі", "нацыянальныя меншасці ў Беларусі", "беларуская дыяспара" і інш.). Такія спецыяльныя курсы У. Навумовіч чытае і сёння для філолагаў і біёлагаў, на факультэце філасофіі і сацыяльных навук. Цяпер навуковец загадвае кафедрай журналістыкі і філалогіі ў Інстытуце сучасных ведаў, дзе нядаўна абраны прафесарам.

Уладзімір Аляксандравіч вядзе актыўную грамадскую дзейнасць. Ён з'яўляецца членам прафсаюзнага камітэта выкладчыкаў і супрацоўнкіаў БДУ, сябрам Саюза беларускіх пісьменнікаў і яго прыёмнай камісіі, удзельнічае ў працы рэўкамісіі Беларускага літаратурнага фонду, шчыльна супрацоўнічае з беларускай дыяспарай, паспяхова займаецца выхаваўчай работай сярод студэнтаў універсітэта.

У. Навумовіч мае дзвюх дарослых дачок: старэйшая — Наталля — доктар, малодшая — Таццяна — адвакат, скончыла аспірантуру БДУ. У Уладзіміра Аляксандравіча трое ўнукаў — Валерыя, Максім і Танечка.

У сваю даволі значную веху жыцця наш юбіляр яшчэ поўны задум, аптымізму, яшчэ толькі намеціў для сябе нямала зрабіць і ў паўсядзённай працы, і ў навуцы, і ў мастацкай літаратуры.

Няхай жа здзейсніцца задуманае!

*Мікалай ПРЫГОДЗІЧ,*
*доктар філалагічных навук,*
*загадчык кафедры гісторыі беларускай мовы БДУ*

КУРСЫ

## Вучэбна-адукацыйная ўстанова БДУ "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы"

ЗАПРАШАЕ НА КУРСЫ ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ НА IV КВАРТАЛ 2003 Г. ВЫКЛАДЧЫКАЎ І СУПРАЦОЎНІКАЎ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ ПА НАСТУПНЫХ НАПРАМКАХ:

**1.** Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі ў забеспячэнні і выкладанні дысцыплін гуманітарнага і сацыяльна-эканамічнага цыклу (для прафесарска-выкладчыцкага складу і вучэбна-дапаможнага персаналу кафедраў сацыяльна-гуманітарнага цыклу ВНУ, сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў) — *20.10—01.11 з адрывам ад працы;*

**2.** Арганізацыйна-педагагічныя аспекты сацыяльнага менеджменту ва ўмовах дзвюхступеннай падрыхтоўкі спецыялістаў (для супрацоўнікаў выхаваўчай работы з моладдзю, загадчыкаў інтэрнатаў) — *20.10—31.10 з адрывам ад працы;*

**3.** Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы: метадалогія і методыка выкладання (для выкладчыкаў ВНУ) — *20.10—31.10 з адрывам ад працы;*

**4.** "Правы чалавека": мадэляванне вучэбнай дысцыпліны (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) — *03.11—15.11 з адрывам ад працы;*

**5.** Чалавек у свеце культуры. Мадэляванне курса СМК (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) — *03.11—15.11 з адрывам ад працы;*

**6.** Прыкладныя сістэмы апрацоўкі і інфармацыі (для выкладчыкаў прыродазнаўчых і тэхнічных дысцыплін ВНУ, сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў) — *03.11—15.11 з адрывам ад працы;*

**7.** Асновы эканамічнай тэорыі (для выкладчыкаў ВНУ) — *10.11—22.11 з адрывам ад працы;*

**8.** Удасканаленне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў ва ўмовах шматцыклічнай арганізацыі навучальнага працэсу (для рэктараў і прарэктараў) — *10.11—14.11 з адрывам ад працы;*

**9.** Айчынная і сусветная гісторыя: новае ў змесце і выкладанні (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ, ПТВ, СШ і інш.) — *10.11—22.11 з адрывам ад працы;*

**10.** Дзвюхступенная псіхолага-педагагічная падрыхтоўка спецыялістаў: навукова-тэарэтычныя і метадычныя аспекты (выкладчыкі ВНУ) — *10.11—22.11 з адрывам ад працы;*

**11.** Сучаснае інфармацыйнае грамадства: тэндэнцыі і праблемы (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) — *17.11—29.11 з адрывам ад працы;*

**12.** Кафедра — цэнтр вучэбна-метадычнай і навукова-даследчай работы ва ўмовах дзвюхступеннай падрыхтоўкі спецыялістаў (для загадчыкаў кафедраў) — *24.11—05.12 з адрывам ад працы;*

**13.** Псіхалогія зносін (выкладчыкі, практычныя псіхолагі) — *24.11—20.12 (2 разы ў тыдзень) з частковым адрывам ад працы;*

**14.** Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі ў выкладанні прыродазнаўчых дысцыплін (для выкладчыкаў ВНУ) — *24.11—27.12 з частковым адрывам ад працы;*

**15.** Асновы права (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) — *01.12—13.12 з адрывам ад працы;*

**16.** Мадэляванне выхаваўчага працэсу ў ВНУ ва ўмовах структурнай трансфармацыі навучальнага працэсу (для сацыяльных педагогаў аддзелаў выхаваўчай работы з моладдзю) — *08.12—19.12 з адрывам ад працы;*

**17.** Сучасныя праблемы выкладання сусветнай літаратуры (для выкладчыкаў) — *08.12—20.12 з адрывам ад працы;*

**18.** Этыка і этыкет: тэорыя, методыка, практыкум (для выкладчыкаў) — *01.12—13.12 з адрывам ад працы.*

Калі Вас зацікавіла наша інфармацыя і Вы гатовыя прыняць удзел у курсах, тэлефануйце па №№ 222-83-03, 220-20-47 *для папярэдняга запісу ў групы.*

**Наш адрас: г.Мінск, вул. Маскоўская, 15, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы БДУ, каб. 319, тэл/факс 220-25-51.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года
Заснавальнік газеты – БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

*23 кастрычніка 2003 года*
*Падпісана да друку 22.10.2003*
*Ум. друк. арк. 1*
*Зак. 1123. Тыраж 1000 экз.*

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Распрацоўшчык лагатыпа і дызайну газеты У.У. Васюк*

*Газета надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ" 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*

Рэдактар Т.М. КАЗАК

*Адрас рэдакцыі: 220050, Мінск, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 209-53-45, e-mail: Gazeta@bsu.by*